

Рэканструкцыя галавы юнака з пахавання Лукомскага гарадзішча. Аўтар І. У. Чаквін

масць уявіць, як жылі людзі ў розныя перыяды старажытнасці, даведацца аб родзе іх заняткаў, адносінах паміж сабой, падзеях, якія адбываліся на нашай зямлі.

У музеі старажытнабеларускай культуры маецца скульптурны партрэт жанчыны XVII ст. з Лукомля.

У 1974—1978 гг. на тэрыторыі Чашніцкага і 6 іншых раёнаў Віцебскай вобл. праводзіліся комплексныя антрапалагічныя даследаванні гістарычных і біялагічных аспектаў развіцця чалавека.

Археалогія і нумізматыка Беларусі (Энцыклапедыя). Мн., 1993.

Дучиц Л. В. Археологические памятники северо-запада Полоцкого княжества. Вильнюс, 1982.

Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Віцебская вобласць. Мн., 1982. С. 442—453.

Каваленя А. Зм. Археалагічныя росшукі ў вярхоўях рэк Друці, Усяж-Бук і Лукомкі // Працы секцыі археалогіі. Мн., 1932. Т. 3. С. 187—197.

Поболь Л. Д. Археологические памятники Белоруссии. Мн., 1983. С. 193—196.

Романов Е. Р. Раскопки в Могилевской губернии 1883// Труды МАО, вып. 1. Т. 13. С. 146—150.

Список памятников истории и культуры республиканского значения Белорусской ССР. Мн., 1990. Т. 1. С. 81—84; Т. 2. С. 64—65.

Тегако Л. И. Антропологические исследования в Белоруссии. Мн., 1979.

Штыхаў Г. В. Крывічы. Мн., 1992. С. 155—156.

Штыхов Г. В. Раскопки в Лукомле в 1966—1968 годах // Древности Белоруссии. Мн., 1969. С. 302, 316—351.

*Н. Кіндзяева*

## Даследчыкі старажытнасцей Чашніцкай зямлі

**Аляксееў Леанід Васільевіч** (н. 15 студз. 1921, г. Растоў-на-Доне, Расія), археолаг і гісторык. Доктар гістарычных навук. У 1951 г. абследаваў гарадзішча ля вёсак Дварэц і Лукомль.

**Бубенька Таццяна Станіславаўна** (н. 8 чэрв. 1957, г. Беразіно), беларускі археолаг. Кандыдат гістарычных навук. У 1981 г. абследавала гарадзішчы ля вёсак Гара, Грынькі, Дварэц, Рудніца, Ясяноўкі. Выявіла і абследавала селішча ля в. Падрэзы, курган ля в. Бор, курганны могільнік ля вёсак Рыжанкі, Сіманавічы, Стаўбцы. Выявіла курганны могільнік ля в. Грынькі. Абследавала курганы і курганныя могільнікі ля вёсак Антаполле, Аўсянікі, Васькаўшчына, Гара, Гогалеўка, Зашур'е, Запружаны, Іванск, Старыя Лаўкі, Труханавічы, Трылесіна.

**Зайкоўскі Эдвард Міхайлавіч** (н. 18 лістап. 1952, в. Дубашы Валожынскага раёна), беларускі археолаг. Кандыдат гістарычных навук. У 1981 г. абследаваў стаянку Гарадок ля в. Старыя Лаўкі.